| | |
|---|---|
| АДДЗЕЛ АДУКАЦЫІ<br>АСТРАВЕЦКАГА РАЙВЫКАНКАМА | ОТДЕЛ ОБРАЗОВАНИЯ<br>ОСТРОВЕЦКОГО РАЙИСПОЛКОМА |
| **ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ “РЫТАНСКАЯ ПАЧАТКОВАЯ ШКОЛА”** | **ГОСУДАРСТВЕННОЕ УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ «РЫТАНСКАЯ НАЧАЛЬНАЯ ШКОЛА»** |
| ЗАГАД | ПРИКАЗ |
| 01.09.2023 № 20 | |
| аг.Рытань, Астравецкі раён | аг.Рытань, Островецкий район |

Аб арганізацыі інавацыйнай дзейнасці ў 2023/2024 навучальным годзе

З мэтай удасканалення навукова-метадычнага зябеспячэння дзейнасці ўстановы адукацыі, укаранення вынікаў навуковых даследванняў і інавацыйных дасягненняў у масавую практыку на падставе загада Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 28.08.2023 № 411 “Аб эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці ў 2023/2024 навучальным годзе”, загада аддзела адукацыі Астравецкага райвыканкама “Аб арганізацыі інавацыйнай дзейнасці ва ўстановах адукацыі раёна ў 2023/2024 навучальным годзе” ад 31.08.2023 № 403, у адпаведнасці з Інструкцыяй аб парадку здзяйснення эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці ў галіне адукацыі, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 01.09.2011г. № 251 (у рэд. Пастановы МА РБ 23.08.2022 № 276)

ЗАГАДВАЮ:

1.Арганізаваць дзейнасць установы адукацыі па рэалізацыі інавацыйнага праекта “Укараненне мадэлі развіцця гатоўнасці педагога да прафесійнай самарэалізацыі ў інтэграванай адукацыйна-прафесійнай прасторы”.

2. Вызначыць інавацыйную групу ў наступным складзе:

2.1. Радзько Л.Ч., дырэктар установы адукацыі – агульнае кіраўніцтва праектам, матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне, праводзіць інфармацыйнае суправаджэнне інавацыйнай дзейнасці;

2.2. Масойць А.С., намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце – кіраўнік інавацыйнай групы, арганізуе інавацыйную дзейнасць, забяспечвае кантроль, здзяйсняе аналітычную функцыю, абагульняе матэрыялы;

2.3. Кухарчык В.І. – настаўнік пачатковых класаў;

2.4. Радзько Л.М. – настаўнік пачатковых класаў;

2.5. Тарарук М.І. – настаўнік пачатковых класаў.

3. Устанавіць у адпаведнасці з “Калектыўным дагаворам дзяржаўнай установы адукацыі “Рытанская пачатковая школа” на 2022/2025 гады

У справу 01-04

(дадатак 2 “Палажэнне аб размерах і парадку здзяйснення стымулюючых і кампенсуючых выплат (акрамя выплат, размеры і парадак здзяйснення якіх вызначаны заканадаўствам) работнікам дзяржаўнай установы адукацыі “Рытанская пачатковая школа”)):

3.1. педагогам, якія прымаюць удзел у рэалізацыі інавацыйнага праекта, надбаўку за характар працы (п.8 за удзел у арганізацыі эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці ў сферы адукацыі, правадзімай у адпаведнасці з артыкулам 89 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі);

3.2. намесніку дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Масойць А.С., якая забяспечвае кантроль і аналітычную функцыю інавацыйнага праекта, прэміраванне згодна п. 3.16.

4. Намесніку дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Масойць А.С.:

4.1. унесці карэктывы і зацвердзіць каляндарны план інавацыйнай дзейнасці на 2023/2024 навучальны год

да 03.09.2023;

4.2. арганізаваць трансляцыю перадавога вопыту, асвятлаць ход і вынікі інавацыйнай дзейнасці ў сродках масавай інфармацыі, на афіцыйных акаўнтах у сацыяльных сетках

пастаянна;

4.3. прадставіць у дзяржаўную ўстанову адукацыі “Астравецкі вучэбна-метадычны кабінет” (Апановіч Л.М.):

4.3.1. прамежкавую справаздачу аб выніках інавацыйнай дзейнасці

да 01.04.2024;

4.3.2. копію загада аб арганізацыі інавацыйнай дзейнасці ва ўстанове адукацыі

да 17.09.2023.

5. Кантроль за выкананнем дадзенага загада ўскласці на намесніка дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Масойць А.С.

Дырэктар Л.Ч.Радзько